## РЭНАВАЦЫЯ ЭТНАМАСТАЦТВА

**Рэнавацыя этнамастацтва** (ад *лац.* renovatio – абнаўленне, аднаўленне, рамонт) – *працэс паляпшэння, абнаўлення элемента народнага мастацтва без разбурэння цэласнасці яго структуры, пры якім магчыма частковае змяненне яго функцыянальнага прызначэння.* На прынцыпах рэнавацыі заснавана дзейнасць такіх цэнтраў трансляцыі і папулярызацыі этнамастацтва, як музей-скансэн (наладжванне ў аўтэнтычных архаічных гаспадарчых і жыллёвых будынках сучаснай экскурсійнай і рэкрэацыйнай дзейнасці) і такіх з'яў пост-фальклору, як этна-паб і этна-дыскатэка, у якіх новае пакаленне носьбітаў этнакультуры знаёміцца з традыцыйнай кулінарыяй і харэапластыкай свайго народа. Рэнавацыя дазваляе культурнай спадчыне этнасу ў новых умовах застаецца «фактарам захавання этнаэкалогіі і этнічнай цэласнасці», выконваць сваю спрадвечную функцыю.

### ЛІТАРАТУРА

1. *Калацэй, В.* Параўнальная міфалогія / В. Калацэй. – Мінск: Зорны верасень; Паркус плюс, 2009. – С. 96.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СУБКУЛЬТУРА КАЛЕКЦЫЯНЕРАЎ У ФАЛЬКЛОРНЫМ РУХУ

**Субкультура калекцыянераў у фальклорным руху** (ад *лац.* sub – пад, cultura – культура і collectio – збіранне, збор) – *частка ўдзельнікаў фальклорнага руху канца XX стагоддзя, якая, у адрозненні ад музыкаў, танцораў, спевакоў, пачынала займацца народнай творчасцю як калекцыяніраваннем артэфактаў народнага мастацтва (музычных інструментаў, тэкстылю, побытавых рэчаў).* Найбольш яскравымі прадстаўнікамі гэтай субкультуры ў Беларусі з'яўляюцца Уладзімір Бярбераў, Алесь Лось, якія пачыналі працаваць у музейных установах, паралельна фарміруючы ўласныя калекцыі артэфактаў. Паступова, каб функцыянальна выкарыстоўваць артэфакты сваіх калекцый, яны мусілі асвойваць іх практычна (граць на музычных інструментах, наладжваць, рамантаваць іх, рабіць сучасныя рэплікі; апранаць народныя строі на святы, урачыстасці і г. д.) і збіралі вакол сябе сваіх маладых аднадумцаў, навучаючы іх, а таксама ствараючы творчыя калектывы: «Ліцьвіны», «Капэлу Алеся Ляся» і інш. Фактычна, такім чынам з'ўляліся адрозныя ад іншых па светапогляду і паводзінах асобы, аб'яднаныя ў сацыяльныя групы носьбітаў гэтай субкультуры.